

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я.КУПАЛЫ

*№ 8 (236) 3 верасня 1996 года, аўторак*


## З НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДАМ!

*Вітаю Вас, дарагія нашы студэнты, шаноўныя калегі, а найбольш Вас, першакурснікі, з пачаткам новага навучальнага года. Для Вас, учарашніх абітурыентаў, сёлетні верасень - стартавы ў імклівым, змястоўным і не надта лёгкім студэнцкім жыцці, гэта першая прыступка вышэйшай школы і, можа, вялікай навукі. Наш універсітэт паспрыяў многім здольным выпускнікам у прафесійным станаўленні. З цягам часу Вы даведаецеся аб людзях, якімі мы ганарымся, а іх шмат, дасягнуўшых вяршынь спачатку ў вучобе, затым у працы і навуцы.*

*Багатая і біяграфія нашай ВНУ. Дастаткова сказаць, што папярэднікам сучаснага універсітэта быў настаўніцкі інстытут, адкрыты ў Гродне ў 1941 годзе. Хаця праіснаваў ён нядоўга, але паклаў пачатак вышэйшай адукацыі ў нашым рэгіёне. Сёлета мы можам лічыць, што нашаму універсітэту 55 гадоў.*

*Вучоба ды і праца ў новым навучальным годзе будуць досыць насычанымі і нялёгкімі. У рэспубліцы распрацоўваецца стратэгія рэфармавання вышэйшай школы, а гэта патрабуе ад нас актыўнага ўдзелу, творчага падыходу і, урэшце, канкрэтных спраў. Адзін з напрамкаў гэтай вялікай працы - падрыхтоўка высокаадукаваных спецыялістаў у галіне кіравання і эканомікі. Гэтым мы зоймемся ўжо ў новым навучальным годзе. Шмат давядзецца зрабіць і па павышэнні якасці навучальнага працэсу ў цэлым.*

*Новы год будзе адметны і тым, што закончыцца стварэнне агульнауніверсітэцкай камп'ютарнай сеткі сувязі і можна будзе шырока карыстацца паслугамі электроннай пошты, а таксама глабальнай міжнароднай інфармацыйнай сеткай дадзеных "ІНТЭРНЕТ". Спадзяюся, што атрымае фінансавую падтрымку ЕС сумесны Еўрапейскі праект "ТЕМПУС TACIS", і гэта дасць магчымасць паправіць матэрыяльна-тэхнічную базу універсітэта, здзейсніць карэнную перападрыхтоўку кіруючых кадраў факультэтаў і універсітэта.*

*У гэтым годзе шырэй будзем укараняць у вытворчасць і навуку распрацоўкі нашых вучоных, будуць створаны рэальныя ўмовы для прадпрымальніцтва, а дапаможа нам у гэтым бізнес-інавацыйны цэнтр, які ўжо хутка павінен распачаць сваю дзейнасць.*

*Наш універсітэт - адзіная ў рэспубліцы вышэйшая навучальная ўстанова, якая працуе ў дзве змены. Спадзяюся, што ў гэтым годзе гарвыканкам, аблвыканкам дапамогуць нам палепшыць умовы працы і навучання.*

*Спраў у нас шмат і амаль няма сярод іх другарадных. І іх нам вырашаць усім разам - выкладчыкам, супрацоўнікам, студэнтам. Няхай для кожнага з Вас новы навучальны год будзе найбольш плённым у працы і вучобе. Зробім жа ўсё для росквіту нашага універсітэта і для добрай славы аб ім.*

*Л.М. КІВАЧ, рэктар ГрДУ імя Янкі Купалы.*



*З добрым настроем, з жаданнем паспяхова працягваць вучобу сустракаюць новы навучальны год сёстры-блізняты, трэцякурсніцы Ірына і Марына Федарчук.*

*Ірына - будучы мастак, натура творчая, вучыцца на аддзяленні мастацтваў факультэта педагогікі і псіхалогіі, Марына - будучы фізік. Абедзве ведаюць, што вучоба - не "цукар", яна патрабуе шмат часу, сіл, не заўсёды адорвае пяцёркамі ў залікоўцы. Але ў гэтым навучальным годзе няхай у дзяўчынак будуць толькі выдатныя і добрыя адзнакі.*

*Фота Ул. Сарокіна.*

## ПАСЫЛКА З ВЕНГРЫІ

Мінулай восенню намеснік дэкана па навуцы факультэта права і эканомікі універсітэта В.В. Сядзельнік разам з калегамі іншых навучальных устаноў Беларусі, а таксама Украіны і Малдовы пабывала ў Будапешце, у Інстытуце канстытуцыйнай і заканадаўчай палітыкі. Тады і была дасягнута дамоўленасць аб гуманітарнай дапамозе гродзенскім студэнтам-юрыстам. І вось у канцы чэрвеня факультэт права і эканомікі атрымаў выдатную бібліятэчку - літаратуру па міжнародным і грамадзянскім праве, па тэорыі права, па ўсеагульнай гісторыі дзяржавы і права і інш. Усяго - 10 найменняў кніг, амаль на тысячу долараў ЗША. Гэта не апошняя пасылка. Мяркуецца, што ўвосень бібліятэка факультэта папоўніцца новай літаратурай з Венгрыі.

## ЛЕТНІ УНІВЕРСІТЭТ У БУДАПЕШЦЕ

Лета - не толькі час водпускаў. І творчай працы - таксама. У ліпені ў Будапешце працаваў летні універсітэт пры Цэнтральна-Еўрапейскім універсітэце, які ажыццяўляе Праграму падтрымкі вышэйшай адукацыі. Усе фінансавыя выдаткі ўзяў на сябе Фонд Сораса.

Сёлета летні універсітэт у Будапешце сабраў упраўленцаў-менеджэраў сістэмы вышэйшай адукацыі з Малдовы, Украіны, Казахстана, Балгарыі і Беларусі. Прайшоў курс навучання і атрымаў адпаведны сертыфікат і прадстаўнік нашага універсітэта - І.Б. Захарчанка.

У гутарцы з карэспандэнтам Ігар Барысавіч адзначыў, што перад слухачамі летняга універсітэта выступілі "свяцілы" навукі ў пытаннях упраўлення вышэйшай адукацыяй. Заняткі былі арганізаваны ў выглядзе дынамічных насычаных семінараў. Кожны з прысутных меў магчымасць падзяліцца думкамі, як трэба і як на самой справе праводзяцца рэформы вышэйшай школы, як ідзе працэс адаптацыі да новых умоў, як перададольваць супраціўленне пераменам і г.д.

Летні універсітэт адчынены для ўсіх, сказаў Ігар Барысавіч. І многія жадаючыя могуць набыць у ім веды. Адна з асноўных умоў - валоданне англійскай мовай. А з усімі, больш канкрэтнымі пытаннямі ўдзелу ў семінарах па Праграме падтрымкі вышэйшай адукацыі звяртайцеся ў аддзел замежных сувязяў універсітэта, пакой 208б у галоўным корпусе.



# Вітаем, племя маладое, незнаёмае!

## У ДОБРЫ ШЛЯХ, ПЕРШАКУРСНІК!

*Верасень. У студэнцкай сям'і універсітэта - папаўненне. Праз год-другі, мабыць, імёны сёлетніх першакурснікаў аб многім нам раскажуць, бо раскрыецца іх талент, будзе відавочным імкненне да навукі. Сёння наших першакурснікаў больш красамоўна можна ахарактарызаваць праз лічбы.*

Напярэдадні новага навучальнага года карэспандэнт газеты "Гродзенскі універсітэт" гутарыў з намеснікам старшыні прыёмнай камісіі **І.П. Мартынавым.** Ён, у прыватнасці, заначыў, што сёлетні план набору студэнтаў для дзённай формы навучання за бюджэтныя сродкі складаў 900 студэнтаў. Было пададзена 1959 заяў. Вытрымалі ўступныя экзамены 1302 абітурыенты. Студэнтамі першага курса залічаны 915 абітурыентаў, вытрымаўшых конкурс. Ён, у сярэднім, складаў 2,19 на адно месца. Гэта прыкметна больш, чым летась, калі на месца прэтэндавала 1,7. Да пяці чалавек на месца - такі конкурс склаўся па найбольш прэстыжных сярод абітурыентаў спецыяльнасцях - псіхалогія, правазнаўства, замежныя мовы, МЭА.

У адпаведнасці з планам мэтавага прыёму было зацверджана 246 месцаў на педагагічныя спецыяльнасці, на якія было пададзена 284 заявы, а ў выніку залічана па мэтавых накіраваннях 194 студэнты. З іх па субяседванню - 100 студэнтаў.

Ад медалістаў сярэдніх школ, ліцэяў, гімназій было пададзена 413 заяў. Па выніках субяседвання (мэтавы прыём) з іх залічаны 100 чалавек, а па выніках экзаменаў - 195 чалавек. Пацвердзілі медаль 159 медалістаў.

Ад выдатнікаў сярэдніх спецыяльных навучальных установ і СПТВ была пададзена 41 заява, а залічаны 21 выдатнік. У адпаведнасці з рашэннем прыёмнай камісіі быў зацверджаны парадак правядзення выпускных сумяшчальных экзаменаў для выпускнікоў ліцэяў і гімназій Гродзенскай вобласці з удзелам іх у конкурсе на вызначаныя у рамках 20 працэнтаў месцаў ад агульнага плану прыёму на кожную спецыяльнасць. 175 выпускнікоў ліцэяў і гімназій здавалі выпускныя сумяшчальныя экзамены. 81 з іх рашэннем прыёмнай камісіі быў рэкамендаваны да залічэння па агульнаму загаду пасля здачы ўступных экзаменаў і, урэшце, залічана 76 выпускнікоў ліцэяў і гімназій на першы курс універсітэта.

У бягучым годзе ва універсітэце ажыццяўлялася падрыхтоўка для паступлення ва універсітэт і іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны на аддзяленні дауніверсітэцкай падрыхтоўкі. Здавалі экзамены на АДП 709 слухачоў.З іх падалі дакументы ў прыёмную камісію 457 слухачоў, 275 з іх сталі першакурснікамі.

Як відаць, сёлетняе папаўненне студэнтаў - людзі не выпадковыя. Яны здольныя да вучобы, да навукі, мэтанакіраваныя. Няхай жа і ў студэнцкім жыцці ім садзейнічае поспех!



*Праз хвілінку - уступны экзамен.* *Фота Ул. Сарокіна.*

## ЯКІЯ МЫ?

У прыёмнай камісіі ёсць дадзеныя па сацыяльна-дэмаграфічнаму складу паступіўшых ва універсітэт. Вось некаторыя лічбы.

Рабочыя або дзеці рабочых - 304 чал. Калгаснікі ці дзеці калгаснікаў - 49 чалавек. Служачыя ці з сем'яў служачых - 561 чал. Жанчын - 557, мужчын - 358. Жыхароў з сельскай мясцовасці - 235. Жыхароў Гродзенскай вобласці - 878, у тым ліку з г. Гродна - 505. Жыхароў Рэспублікі Беларусь - 908. Жыхароў іншых краін СНД - 7. Беларусаў - 601, рускіх - 116, палякаў - 179, іншыя - 19.

## ТАК ХОЧАЦЦА ВУЧЫЦЦА!

Усё больш жадаючых набыць вышэйшую адукацыю ў нашым універсітэце праз платную форму навучання. Трэба было бачыць, які натоўп атакаваў (у самым дакладным сэнсе слова) аўдыторыю № 209 з 5 па 10 жніўня. Тут прымалі дакументы на платную форму навучання. Металічны бар'ер не мог стрымаць націску жадаючых вучыцца ў нашай Alma Mater. Будучыя так званыя студэнты-платнікі ад гарачыні і націску натоўпу ля дзвярэй ледзь не трацілі прытомнасць. У выніку студэнцкая сям'я універсітэта папоўнілася яшчэ на 716 чалавек (дзённая, завочная, вячэрняя формы навучання і другая вышэйшая адукацыя).

## ДЛЯ ЗАМЕЖНЫХ СТУДЭНТАЎ

Атрымалі сертыфікат устаноўленага ўзору і змогуць працягваць вучобу ў іншых ВНУ нашай рэспублікі 16 юнакоў з Пакістана. За год вучобы на падрыхтоўчым аддзяленні для замежных студэнтаў нашага універсітэта яны атрымалі пэўны аб'ём тэарэтычных ведаў і моўную практыку, больш даведаліся пра гісторыю, культуру, звычкі беларускага народа. Такая форма навучання замежных студэнтаў ужо традыцыйная, практыкуецца не першы год. А сёлета знойдзена і новая форма навучання - летняя школа для замежных грамадзян, у якой яны месяц спасцігалі рускую і беларускую мову. У першай дэкадзе жніўня летнюю школу закончылі пяцёра палякаў, навучаліся ў ёй грамадзяне Даніі, будуць вучыцца грамадзяне ЗША.

*Л. ЯРУНЦАВА,*
*супрацоўнік аддзела замежных сувязяў, маркетынгу і права.*

# Вітаем, племя маладое, незнаёмае!



## НЯМА ВЫПАДКОВЫХ

Напярэдадні новага навучальнага года карэспандэнт "Гродзенскага універсітэта" гутарыў з дэканам матэматычнага факультэта **Т.Э. Можджэрам.** На пытанне: якое папаўненне прыйшло на факультэт? - Тадэвуш Эдвардавіч занзначыў:

- Лічыцца, што калі хто ідзе вучыцца на матэматычны факультэт, дык матэматыку ведае даскانала і значна шырэй, чым школьная праграма. Са 105 першакурснікаў гэтага года, мяркую, няма ніводнага выпадковага чалавека. Да нас прыйшлі вучыцца залатыя і сярэбраныя медалісты, пераможцы і ўдзельнікі абласных і рэспубліканскіх алімпіяд. Сталае папаўненне атрымаў універсітэт са школы-гімназіі і ліцэя.

Глыбокія веды і імкненне вучыцца на нашым факультэце, спасцігаць цяжкую і складаную навуку на нашых кафедрах прывялі на матфак медалістаў Сяргея Гаманчука, Вольгу Ахметаву, Марыну Грыцай, прызёраў алімпіяд Андрэя Бабкіна, Наталлю Дзееву і многіх юных матэматыкаў.

Быў у нас сёлета і такі выпадак. Падаў дакументы і паступіў на спецыяльнасць "Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій" выпускнік школы-гімназіі N 30 медаліст Станіслаў Гушча. Ён жа быў у ліку абітурыентаў мінулага года, вучыўся на першым курсе па спецыяльнасці "Матэматыка". Але, відаць, у працэсе вучобы адчуў, што выбар зрабіў няўдала, а паколькі на другую спецыяльнасць перавесціся не было магчымасці, ён пакінуў вучобу па асабістаму жаданню і сёлета паступіў зноў, асэнсаваўшы выбар больш адказна.

Жадаю першакурснікам матфака, усім студэнтам, якія ў верасні папоўнілі універсітэт, плённай вучобы, моцнага сяброўства, няхай ваша студэнцкае жыццё будзе цікавым і змястоўным.



## БУДЗЕ "КАПУСНІК"

"Універсітэт - вачыма першакурснікаў" - менавіта пад такім дэвізам плануецца правесці ў канцы кастрычніка студэнцкі "капуснік", спаборніцтва паміж першакурснікамі ўсіх факультэтаў. Учарашнім школьнікам, што папоўнілі студэнцкія аўдыторыі, даецца ўнікальная магчымасць выказаць свае першыя ўражанні пра нашу Alma Mater. Зрабіць гэта можна ў любой форме сцэнічнага выступлення па сцэнарыю, які вам падкажуць ваш інтэлект, ваша фантазія, пачуццё гумару, творчае натхненне.

Праграма павінна быць разлічана на 20-30 хвілін. Колькасць удзельнікаў - неабмежаваная, жанры выбірайце на ваш густ.

Кансультацыю па ўсіх пытаннях удзелу ў "капусніку" можаце атрымаць у студэнцкім клубе (галоўны корпус, аўдыторыя 217), звяртайцеся да мастацкага кіраўніка СТЭМа Валерыя Ляховіча.

## Амаль што анекдот...

*Тое, што ўдалося даведацца карэспандэнту "Гродзенскага універсітэта" ад нашых экзаменатараў, сапраўды анекдатычна. Такое здаралася. І не дзе-небудзь у трыдзесятай дзяржаве, а ў нашых, універсітэцкіх, аўдыторыях, з нашымі абітурыентамі.*

Некалькі гадоў таму быў такі выпадак. На ўступных экзаменах на пачфак - усе дзяўчаты. І толькі адзін хлопец. З вёскі. Ведаў - не багата. Але экзаменатары "цягнуць" яго з усіх сіл: сельскай школе так не хапае настаўнікаў-мужчын! Пытанні абітурыенту задаюць, як першакласніку. Нарэшце і такое: "Колькі вуглоў у трохвугольніку?". Задумаўся. Маўчыць. Нарэшце адказ: "Два". І ў экзаменацыйны ліст - таксама "два".

* * *

На экзамене па фізіцы экзаменатар пытаецца ў абітурыента: "Як працуе трансфарматар?" У адказ той: "У-у-у-у....", склаўшы губы трубачкай і так зычна, што іншыя абітурыенты аж вочы акругліліі ад нечаканасці.

Сярод студэнтаў першага курса таго небаракі-фізіка, вядома, не было.

* * *

Ужо сёлетняму абітурыенту задаюць пытанне гісторыкі:
- Хто такі Машэраў?
У адказ:
- Рускі генерал.

* * *

Другому сёлетняму абітурыенту задаюць пытанне:
- Якіх вы ведаеце кіраўнікоў партызанскіх атрадаў на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны?
Пасля даволі працяглага роздуму:
-Іван Сусанін...

***(Працяг чытайце ў наступным нумары).***

С. Псевдонимбов

О, жизни вечные секреты-
Она уходит и грядет,
Воспоминания монеты
В копилку памяти кладет.

Пока еще богатств немного,
Но все же дорог золотник,
Пока еще легка дорога
И пролегает напрямик.

И мы, ругаемые теми,
Чья молодость прошла давно,
Так часто слышим: "В наше время..."
А наше время - вот оно!

Потом, лет эдак через двадцать,
Когда из юности уйдем,
будем наслаждаться
Воспоминаньями о нем,

Хулить другие поколенья,
Вступающие в свой рассвет,
Забыв, что были дни рожденья,
Где нам бывало двадцать лет.

Бывало? Дудки, есть и будет!
Ничтожен времени приказ,
И никакие козни судеб
Состарить не сумеют нас.

И пусть брюзжат, что пали нравы,
Что молодежь не та пошла,
Здесь наше время, мы здесь правы,
Не суйтесь не в свои дела!

Но не было еще на свете
Ни до потопа, ни потом,
Чтобы родители и дети
Сошлись во времени одном.

Одни распутными прослыли,
Нося панбархат и батист,
Других без умолку корили
За то, что те танцуют твист.

Но до утра гуляли пары
И целовались у дверей,
И шли по улицам гитары,
Пугая серых голубей.

Творя героев и поэтов,
Верша великие дела,
Ничьих не слушая советов,
Безумно молодость жила.

Мы тоже можем так, чтоб громы,
За правду - в ряд, за ложь - в висок,
И наши подвиги огромны
И флаг наш ярок и высок.

Ведь это наше время, братцы,
Покуда зелено, потом
Мы сможем только наслаждаться
Воспоминаньями о нем.



# АЛАІЗА ПАШКЕВІЧ УГЛЯДАЕЦЦА Ў ДАЛЯЧЫНЬ...

**"ВОСЬ СІМВАЛ ТВОЙ, ЗАБЫТЫ КРАЮ РОДНЫ!**
**ЗВАРУШАНЫ НАРЭШЦЕ ДУХ НАРОДНЫ..."**
*("Санет". Максім Багдановіч)*

На шчучынскай зямлі ўдзячныя землякі і госці сталіся "віноўнікамі" ў добрым сэнсе слова вялікага Свята, прымеркаванага да 120-годдзя з дня нараджэння таленавітай дачкі беларускага народа, паэткі-рэвалюцыянеркі Алаізы Пашкевіч (Цёткі).

Крыху аддаліўся час, але..., як вядома, усё вялікае бачыцца на адлегласці. А калі гэтае "ўсё вялікае" ўсвядомленае і асэнсаванае, то выразна заўважаецца, якою неардынарнаю асобаю ў гісторыі беларускага адраджэнскага руху была і застанецца назаўсёды ва ўдзячнай памяці і добрых справах сённяшніх і будучых нашчадкаў нашых мужная і моцная духам і сваім мастацкім словам Цётка, застанецца "як вечны светач-полымя", як адна з шэрагу першых, што ўзнялі паходню змагання за лепшую, вартасную чалавека долю для нашага народу.

Угодкі таленавітай Пашкевічанкі - гэта не толькі даніна павагі, удзячнасці за зробленае Цёткаю на карысць беларускасці, а гэта, не памылімся, - жывы працэс тварэння нацыянальнай гісторыі, нацыянальнай культуры, усведамлення нацыянальнай духоўнасці.

Угодкі Алаізы Пашкевіч - гэта своеасаблівае сілавое поле, якое ўвабрала шчыра ў сваю арбіту нават тых, на першы погляд абыякавых суайчыннікаў нашых, хто ўпершыню, не зважаючы на ўзрост і пэўныя рангі, даведаўся, дачуўся пра яе, судакрануўся, няхай і ўмненна, з яе прачулым беларускім, нашанскім словам, з яе апантанасцю:

*Прыгарнуць усё ў дарозе,*
*Каплю шчасця, долі ўліць,*
*Думаць усюды аб народзе,*
*Родны край усюды сніць.*

Гэтае сілавое поле "прыцягнула" да сябе добразычлівых, шчырых людзей, як бы ўраз, увачавідкі, зрабіўшы іх аднадумцамі.Той факт, што на ўрачыстасці, звязаныя з угодкамі Цёткі, прыехалі навукоўцы з Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН Беларусі, з Беларускага дзяржаўнага універсітэта, з літаратурнага музея імя Янкі Купалы, амаль што не ўся кафедра беларускай літаратуры Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы, прадстаўнікі абласнога аддзелу культуры, кіраўнікі раённага маштабу і нават вайскоўцы, гаворыць пра многае. І ў першую чаргу, менавіта пра тое, што была праведзена вялікая падрыхтоўчая арганізацыйная праца, задзейнічаны такія якасныя сілы, што не магло не прывесці да плённых вынікаў падчас розных па форме мерапрыемстваў па ўшанаванні памяці Цёткі.

Вельмі шкада, што ў шэрагу артыкулаў, якія з'явіліся пасля ў розных перыядычных выданнях, вельмі суха, амаль незаўважна, гаварылася пра зробленае ў дачыненні да ўгодкаў Алаізы Пашкевіч кафедрай беларускай літаратуры Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. Вельмі шмат у плане арганізацыйным пры правядзенні святочных урачыстасцяў было зроблена загадчыкам кафедры Мікалаем Уладзіміравічам Мікулічам, які званіў, "грукаўся" ў вышэйшыя ўладныя кабінеты, пераканаўча даводзіў, што "угодкі Цёткі - гэта нешта большае за "правёў - забыліся", што яны павінны стацца ў будучым удзячным грунтам, паколькі зямля Гарадзенская ніколі не была беднаю на мастацкія таленты, на мужных духам сыноў і дачок народу нашага. Выступленні супрацоўнікаў кафедры падчас адкрыцця памятнай дошкі на будынку цэнтральнай бібліятэкі горада Шчучына па вуліцы Леніна (спадзяемся, што з часам удзячныя землякі нададуць гэтай вуліцы імя Цёткі), у шматлюдным Доме культуры, на навукова-тэатральнай канферэнцыі, якая з лёгкай рукі старшыні грамадскага камітэту па падрыхтоўцы і правядзенні юбілею пісьменніцы Валянціны Коўтун, аўтаркі дзвюх кніг пра нашу зямлячку, перарасла ў канферэнцыю-спатканне добрых сяброў-аднадумцаў, засведчылі, што пры жаданні навукоўцам кафедры па сілах вырашальны і больш адказныя мерапрыемствы.



Нельга не адзначыць добрым словам, што ўсе выступленні арганізатараў і гасцей Свята гучалі на беларускай матчынай мове. Відавочна, што ўсе, хто выступаў, добра ведалі: Цётка вельмі высока цаніла вартасці беларускай мовы, якая "паднялася высока і стае ўжо поруч з "панскімі мовамі", заклікала любіць яе і шанаваць, паколькі развіццё нацыянальнай культуры, літаратуры народа, на яе думку, немагчыма без развіцця яго роднай мовы. Бо любоў да Радзімы, да свайго народу праяўляецца перш за ўсё праз любоў кожнага з нас да роднага слова.

Як своечасова і надзённа, палымяна і пранікнёна гучаць яе словы ў артыкуле "Шануйце роднае слова", бы ў сэрца б'юць мячамі, выкрасаючы іскры з яго: "Бедны той, хто апрача грошай, апрача багацця, каторае пры першым няшчасці счэзне дазвання, не мае скарбаў вечных - скарбаў душы. Такі скарб, каторы ніхто і ніколі адабраць ад нас не здолее, гэта любоў да бацькаўшчыны, да свайго народу, да роднай мовы... Яна, быццам цэмент, звязвае людзей. Яна дае ім найлепшы спосаб разумець адзін аднаго, адной думкай жыць, адной долі шукаць. Хто адрокся мовы бацькоў сваіх, хто ўздзеў чужую апратку - той адышоў ад народу далёка-далёка. Ён чужы ў роднай вёсцы, у сваёй сям'і. І на яго браты глядзяць, як на чужынца..."

Пісаліся гэтыя радкі Цёткаю напачатку дваццатага стагоддзя. А хіба ж не актуальныя, не прарочыя яны на прыканцы яго ў нашай старонцы?

"Да нашай моладзі звяртаемся мы з гэтымі словамі. Вы, маладыя, найчасцей пападаеце між чужых людзей, што вашай мовы не шануюць, "простай", "мужыцкай" завуць. З вас часта насміхаюцца, калі гаворыце па-свойску. І вы, чуючы гэта, пачынаеце саромецца матчынай мовы, свайго народу... Мейце смеласць усюды голасна казаць па-свойму. Мейце сілу і адвагу дзяржацца роднага слова. І, гледзячы на вас, асмеляцца і іншыя, зразумеюць, што сэрца беларускае б'ецца не толькі пад мужыцкай сярмягай, паверацъ ва ўласныя сілы свае і пойдуць цвёрдай ступою да лепшай будучыні, да ясных зор шчасця народнага".

Заключным жа акордам Свята ў Шчучыне сталася адкрыццё скульптурнага помніка Цёткі. У цэнтры горада, на ўзвышэнні, на ўзбярэжжы штучнага возера, пад дахам велічных хвояў, у задуменнасур'ёзнай паставе яна глядзіць у далячынь. Леваруч - каталіцкі касцёл, а праваруч - праваслаўная царква.

Які сімвалічны малюнак!? Алаіза Пашкевіч углядаецца ў далячынь, як бы спрабуючы прадказаць будучыню народу беларускаму. І, затаіўшы дыханне, мы чуем, як з яе вуснаў льюцца, бы з падземна-жыватворных крыніц, прачула-прарочыя словы:

*Народзе, мой просты*
*народзе!?*
*І плакаць ты моўчкі прывык,*
*У рабскай пакорлівай позе*
*Ізноў на каленях стаіш...*
*Народзе, мой мудры*
*народзе!?*
*Араты, ваяр, міралюб,*
*Шчадрэйшы па наскай*
*прыродзе*
*Зноў скуты, свет белы*
*нялюб...*
*Народзе, мой мужны*
*народзе!?*
*Ў легендах апеты, ў баі.*
*Не гнуўся ніякай уродзе,*
*А ізноў на каленях стаіш...*
*Народзе, мой светлы*
*народзе?*
*Мей памяць - бясцэннейшы скарб,*
*Сыноў, непадкупных у родзе,*
*А сёння - на колінках раб...*
*Народзе, святы мой народзе!?*
*Богу ў вочы ты ўжо не*
*глядзіш,*
*А ў рабскай пакорлівай позе*
*Ізноў на каленях стаіш...*
*Народзе, цярплівы народзе!?*
*Мовы выракся? Пуста ў душы?*
*Хоць ты й найславянскага роду*
*Дайно... на каленях маўчыш...*

**Пятро МАЛЯЎКА,**
***кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай літаратуры.***







# “ВОСЬ, ЗДАЕЦЦА, І ЎСЁ. БЫВАЙЦЕ!”

Чытаю і перачытваю гэтыя горка-сіратлівыя радкі, ашчадна ўглядаюся ў да болю і смугі на вачах знаёмыя і дарагія літары і кожным разам пранікаюся складанай амальгамай утрапёных душэўных перажыццяў. Яны настойна заходзяць у душу, забіраюць дарэшты, не адпускаюць. Гэтыя радкі не проста спараджаюць звычайныя ў такіх выпадках сум і ўмілажаленасць, а развогніваюць шматлікія шчымліва-балючыя думкі і подумкі, нялёгкі сэнс якіх сягае далёка на перыферыю свядомасці і падсвядомасці.

“Завяшчанне” Максіма Танка, афіцыйнае развітанне з жыццём і людзьмі народнага паэта Беларусі, лаўрэата Ленінскай, многіх дзяржаўных і літаратурных прэмій СССР і Беларусі, Героя Сацыялістычнай Працы, акадэміка, шматгадовага старшыні Саюза пісьменнікаў рэспублікі... Гэтыя паўтары старонкі хвалюючага тэксту не сказаць каб зусім анечаканілі мяне, хутчэй наадварот, пацвердзілі ранейшыя назіранні і развагі, папярэднія заключэнні і высновы датычна спамераў і асаблівасцей асобы выдатнага нацыянальнага паэта. Яны арганічна вянчаюць ягоны вобраз, своеасабліва ўхарошваюць яго, надаюць яму закончанасць, глыбінны ўнутраны сэнс і значнасць. Сёння куды як далеглядна бачна: то быў адзін з найсціплейшых і найсумленнейшых літаратараў, якіх калі-небудзь узгадоўвала наша зямля, пісьменнік, які, можа, не гэтулькі сам у сабе выхоўваў прыстойнасць, дабрыню і высакароднасць, вернасць высокім чалавечым ідэалам, колькі быў уганараваны імі маці-прыродай ад народзін. “Чалавечы і мастакоўскі кштalт яго ад Бога”, - пісалі даследчыкі, і з гэтым цяжка не пагадзіцца. Палымянае слова паэта на высокім філасофска-эстэтычным узроўні закадзіравала ў сабе як не ўсю гісторыю народа, яго паступальнага руху да сённяшніх замятушных дзей. Эпохатворчая роля М. Танка з часам штораз будзе адкрывацца нам глыбей, тое, што зрабіў ён, спажыткоўваюць на доўгія дзесяцігоддзі. Халепе часу не пад сілу выступдзіць з яго твораў высокай духоўнасці і маральнага імператыву, гарачага пачуцця любові да Радзімы і чалавека, роднай культуры і мовы.

Так, М. Танк заўсёды глыбока ўсведамляў ратаўнічасць мовы. Вось толькі адзін абразок ягоных высокіх клопатаў і турбот, далёкасяжных думак і ідэй у апошнія месяцы жыцця: “Кожная мова - гэта непаўторны скарб, якім трэба даражыць. З выкрэсліваннем мовы не толькі ты становішся нікім, а і бяднее, губляе многа непаўторных якасцей міжнародная культура...”

Колькіразова прыгадваю яго афіцыйным і адамашненым, зрэдзьчасу памяць высмыквае грозна-сур’ёзным, але часцей разгуліста-рассмяяным, у кіпені гарачых спрэчак і засумлена адзінокім. Гэткае ж і ягонае слова: гарэзлівае і сцішанае, лагоднае, а калі на тое была патрэба, не пазбаўленае жорсткіх актывізмаў, часам няпростае для ўспрыняцця з прычыны актыўных зместава-фармальных пошукаў, але заўжды без вымудраў і штучнага пазёрства, чым сёння грашаць многія маладыя.

Адыходзіў у вечніну ён надзвычайна пакутліва, у жудзе і немачы, горы і няшчасці. Нясцерпны боль неадноўчы вымушаў яго прасіць лекараў і сына-біёлага пасобіць пайсці з жыцця дачасна. Трэба было быць носьбітам неабыякой сілы волі і вытрымкі, каб увідавочваць тое, цвёрда ўсведамляючы, што тваё вымогі анічым не дапамогуць.

Скрышальным ударам сталіся для Танка дачасная смерць дачкі і за лічаныя месяцы да заканчэння яго ўласнага жыццёвага шляху адыход жонкі Любові Андрэеўны. Трымаўся ж ён, як сапраўдны хлебадар-аратай, да канца годна, мужна перасільваў пакуты, трываў боль. Можа быць, таму і быў уганараваны Усявышнім дастаткова лёгкім актам смерці - адыходам у сне.

Душа нудзіцца і не хоча прымаць незваротна-трагічнага зыходу. Неадноўчы лаўлю сябе на несунімным жаданні хоць раз звочыць яго, каб адвітацца, сказаць яму, хто ён такі, які ён вялікі, мудры і добры, незаменны для ўсіх нас, падзарадзіцца духам, набрацца веры, чалавечнасці, парадавацца яго шчыраму імкненню да любові-ладнасці...

То перад табою, дарагі чытач, адзін з варыянтаў “Завяшчання” Максіма Танка (без даты і подпісу), колькі часу таму выяўлены мною ў сямейным архіве паэта.

*Мікола МІКУЛІЧ,*
*загадчык кафедры беларускай літаратуры.*

## ЗАВЯШЧАННЕ

Прашу СП Беларусі дапамагчы мяне пахаваць на Слабадскім магільніку, дзе пахаваны і мае бацькі. Калі памрэ раней Любоў Андрэеўна, крэміраваць і дапахаваць да мяне, бо і яе сваякі, і мае ўсе знайшлі там свой вечны супакой. Я ёй многім абавязаны. Мы ўвесь свой век з ёю не разлучаліся, не хацелася б разлучацца нам і па смерці.

Хаваць мяне прашу без ардэноў, музыкі і прамоў. Не любіў я красавацца на гэтым свеце. Таму прашу пахаваць як найсціплей, як хавалі і хаваюць спрадвеку ў нас усіх.

Прасіў бы не ставіць і помніка. А калі гэта неабходна, можна будзе напісаць на бакавых гранях плоціка маці, хто ляжыць побач з ёю.

Калі будзе нейкі ганарар за мае творы, прасіў бы яго раздзяліць паміж сынам - Скурко Максімам Яўгенавічам і дачкой - Скурко Ірынай Яўгенаўнай. І не надаваць майго імя ніякім школам, памятным мясцінам, бо і так лічу, перастараліся мы ў гэтым. Зараз амаль на кожным доме, школе вісіць па некалькі такіх мемарыяльных дошак, на якія ўжо ніхто не звяртае ніякай увагі. Усё гэта толькі ўносіць несусветную блытаніну, запаўняючы рознай “высокапарнай” непатрэбшчынай старонкі даведнікаў, гісторый, успамінаў, колькасць якіх расце як снежны ком. Вось, здаецца, і ўсё. Бывайце!

*Максім ТАНК.*

***АД РЭДАКЦЫІ:*** *Гэтыя нататкі Мікола Мікуліч напісаў з нагоды першай гадавіны па смерці Максіма Танка. А каб ні тая сумная падзея, мабыць, аўтар у іншым жанры, без жалю і горычы, расказаў нам пра народнага паэта Беларусі, якому ў сёлетнім верасні споўнілася б 84.*

*У апошнія гады Мікола Мікуліч меў нямала сустрэч з Максімам Танкам. Яны далі пачатак напісанню ім новай кнігі, якая ўбачыць свет у наступным годзе, у выдавецтве "Мастацкая літаратура".*



*На здымку: Максім Танк і Мікола Мікуліч.*



*З ЗАЛЫ СУДА*

# БОЙЦЕСЯ АШУКАНЦАЎ!

У сёлетнім верасні ён мог быць разам з аднакурснікамі ў студэнцкай аўдыторыі, думаць аб дыпломе, а можа, меў бы ўжо і самастойную працу ў праваахоўных органах. А ён - дзесьці ў месцах не надта аддаленых, спіць на казённым ложку, прывыкае да турэмнай пахлёбкі з агульнага катла.

Юрый Мазец, дасціпны рухавы хлопец з Ваўкавыска, вучыўся на факультэце правазнаўства Гродзенскага універсітэта. У яго была будучыня, але жаданне жыць лёгка і прыгожа падштурхнула яго здрадзіць здароваму сэнсу, нарабіць безліч памылак, а ў выніку - 5 гадоў пазбаўлення волі. Плачуць у роспачы бацькі, малалетняе дзіця гадуецца без яго ўвагі. А ён жа рыхтаваўся стаць юрыстам, ужо нядрэнна ведаў Грамадзянскі і Крымінальны кодэксы, мог прадбачыць сумны фінал сваіх супрацьзаконных дзеянняў. Але не спыніўся сам і ніхто яго не спыніў, пакуль было не позна...

Першая спроба "лёгкага хлеба", вядомая следству і суду, адбылася ў родным універсітэцкім інтэрнаце па вул. Даватара. Юрый быццам бы пазычыў у студэнта 50 долараў ЗША. Але, як бачна па матэрыялах следства, аддаваць іх не збіраўся. Пасля былі іншыя, і досыць удалыя, спробы ашуканства. Шляхам падману, злоўжываючы даверам добра знаёмых і амаль незнаёмых грамадзян, у асноўным, студэнтаў універсітэта і мединстытута, Ю. Мазец завалодаў вялікай сумай грошай. У ход пайшлі ўзаемныя "выкалочванні" грошай адзін у другога. Некаму павінен быў Мазец, нехта - яму. Раслі працэнты па так званым "лічыльніку". Усё часцей гэта заканчвалася бойкамі-разборкамі, пагрозамі.

Час ад часу апетыт галоўнага героя гэтай гісторыі ўзрастаў. Пачаўшы з 50 долараў, пазней ён ужо браў ці ілжывым шляхам вымагаў намнога большыя сумы грошай. У крымінальнай справе называюцца лічбы: 1650 долараў, якія належалі пацярпеўшаму Ахатовічу С.Л., 2100 долараў, "выбітыя" ў Сямёнава Р.Ю. напачатку гэтай "эпапеі", бо ў агульнай суме падсудны Мазец "нагрэў" Сямёнава на 3746 долараў ЗША, а ва ўсіх сваіх знаёмых падсудны "запазычыў"... амаль 6 тысяч долараў. Заяўленыя па крымінальнай справе іскі пацярпеўшых Мазец павінен будзе кампенсаваць. Аднак сума даволі значная і невядома, калі даверлівыя людзі, падманутыя ашуканцам, атрымаюць свае грошы.

Перш, чым паставіць кропку, хочацца засцерагчы: бойцеся такіх вось ашуканцаў, не патурайце ім у іх брудных гульнях!

*С. МУРЫНА,*
*народны засядацель*
*Ленінскага нарсуда*
*г.Гродна.*

*АНОНС*

# ВЫДАДЗЕНА ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ

Выдавецкі аддзел ГрДУ надрукаваў у апошні час наступныя навучальныя дапаможнікі, якія будуць карыснымі для нашых студэнтаў.

1. Гісторыя сусветнай культуры ў 4-х частках. Частка 1/Пад рэд. праф. Разенфельда У.Д. (на рускай мове).

Гэтая частка прысвечана гісторыі сусветнай культуры з першабытных цывілізацыяў да Новага часу. Кніга добра ілюстраваная.

2. Сільчанка М.У., Басюк І.А. Асноўныя этапы беларускай дзяржаўнасці (на бел. мове).

У дадзеным навучальным дапаможніку зроблена спроба прасачыць станаўленне беларускай дзяржаўнасці са старажытных часоў да цяперашняга часу. З якімі цяжкасцямі сустракалася Беларусь, як яна змагалася за сваю незалежнасць, вы даведаецеся з гэтай кнігі.

3. Жарноў А.М. Элементы астрафізікі. Навучальны дапаможнік па курсе "Астрафізіка" (на рускай мове).

Цікавасць да свету, у якім мы жывём, стымулюе пазнанне яго з найстаражытнейшых часоў. Аднак настолькі бурнага развіцця, як у цяперашні час, астрафізіка яшчэ не ведала. Нараджаюцца і паміраюць тэорыі, якія прасочваюць гісторыю развіцця Сусвету аж да "гарачага пачатку", як нараджаюцца і гінуць зоркі. А вынікам гэтых тэорыяў і эксперыментальных даследаванняў з'яўляюцца тыя часцінкі ведаў, якія чалавецтва паслядоўна назапашвае. Тым не менш, загадкавага ў Сусвеце значна больш, чым вызначанага. І гэта павінна абуджаць думку ў моладзі, для якой і напісаны дадзены дапаможнік. Упершыню прадстаўлены даволі значны аб'ём задачаў па астрафізіцы.

4. Лойка М.О., Штоп І.І. Заданні для чытання на англійскай мове тэкстаў па спецыяльнасці "Правазнаўства".

У кнізе прадстаўлены тэксты па юрыдычнай тэматыцы, падрыхтаваныя на вельмі высокім прафесійным узроўні выкладчыкамі нашага універсітэту.

5. Гачко А.К. Сучасная беларуская мова. Метадычны дапаможнік для студэнтаў.

У кнізе шырока асветлены раздзелы беларускай мовы: фанетыка, арфаэпія, графіка, арфаграфія, лексікалогія, фразеалогія. Яна будзе вельмі карысная не толькі для студэнтаў універсітэта, але і для тых, хто цікавіцца беларускай мовай.

6. Гарадзенскія запісы. Старонкі гісторыі і культуры. Выпуск 2 /Пад рэд. праф. Сцяцко П.У. (на бел. мове).

Другі выпуск навуковага альманаха "Гарадзенскія запісы" прысвечаны вывучэнню гісторыі, культуры і мовы нашага рэгіёну. Тут падаюцца матэрыялы, якія непасрэдна асвятляюць пытанні гісторыі Гарадзеншчыны, лёсы славутых людзей рэгіёну, а таксама народную мову гарадзенцаў і некаторыя лінгвістычныя праблемы.

7. Віц-Маргулес Б.Б. Дыягор Мялоскі. Артыкул, пераклад, каментарый (на рускай мове).

Антычная філасофская спадчына ўяўляе сабою адно з найбагацейшых і найбольш насычаных кірункаў гісторыі сусветнай літаратуры. Прапануемая ўвазе чытача праца вядомага беларускага антыказнаўца Б.Б. Віц-Маргулес уяўляе сабою сур'ёзны прыклад уводзінаў у нашу літаратуру маладаследаванай раней асобы - старажытнагрэчаскага мысліцеля Дыягора Мялоскага (V ст. да н.э.). Выданне разлічана на студэнтаў філасофскіх, гістарычных, філалагічных факультэтаў, аспірантаў і выкладчыкаў гісторыі антычнай філасофіі.

Гэтыя і іншыя выданні, якія надрукаваны ў выдавецкім аддзеле нашага універсітэта, можна набыць ва універсітэцкім кніжным кіёску.

*Н. КРАСНІЦКАЯ.*

# ХРАНІЧНАЯ "ХВАРОБА" АЎДЫТОРЫЙ

У сярэдзіне жніўня, калі я наведала універсітэцкі вучэбны корпус па вул. Даватара, там "уладарылі" камендант, дзяжурная, сталяр, некалькі прыбіральшчыц. Усім было горача, хаця надвор'е выдалася не спякотлівае. Гэтыя сціплыя людзі, маючы сціплыя заробкі на сваіх непрэстыжных пасадах, завіхаліся ў калідорах і кабінетах. Не без гонару за зробленае правала мяне па паверхах гэтага вялікага будынка Валянціна Гаўрылаўна Вярбіцкая. Усё тое, што яшчэ ў маі - чэрвені было зламана, зрэзана, забруджана, перад новым навучальным годам было старанна пабелена і пафарбавана. Прыемна было бачыць бялюткія дзверы і падаконнікі, роўныя палоскі фарбы на лесвіцах, чыстыя панэлі калідораў. Абноўлены амаль усе сталы ва аўдыторыях. Нажаль, глыбока парэзаныя надпісамі, нават пад пластам фарбы, яны і зараз захоўваюць сляды варварскага "летапісу" некалькіх пакаленняў студэнцтва. Чаго ў тых аўтографах толькі няма! Нашы разумныя дасціпныя вострасловы, няхай бы яны свой інтэлектуальны запал накіроўвалі на нешта іншае, стваральнае, а яны спаборнічаюць адзін перад другім у пахабных выразах. Ды якіх!

- І дзяўчаты, і хлопцы кураць дзе прыйдзецца. Тушаць цыгарэту аб сцяну ці аціпляльную батарэю. А паспрабуй зрабіць заўвагу - такое ў адказ пачуеш, што горача стане. Мэблі пераламалі за навучальны год, - расказвала Валянціна Гаўрылаўна, - не палічыць. З двух-трох сталоў ці крэслаў збіралі нешта адно. Усе сцены, мэбля ўклеены жуйкамі, перад афарбоўкай усё прыходзілася здзіраць, змываць...

Валянціна Гаўрылаўна лічыць, што толькі заўвагамі тэхнічных работнікаў агульную "хваробу" не вылечыць. Трэба, каб педагогі больш увагі звярталі на гэты бок выхавання, каб часцей напаміналі студэнтам пра культуру паводзін і неабходнасць захаванасці маёмасці. Грошай жа ва універсітэта не багата, каб вось так бессаромна ўсё псаваць.

В. Г. Вярбіцкая вельмі ўдзячна работнікам, якія, не зважаючы на час, у гарачую летнюю пару па 8-10 гадзін у дзень займаліся рамонтам: М.С. Данілюк, С.В. Рыхліцкай, Д.В. Вінчы, А.Ю. Локіс, сталяру І.М. Тарасевічу.

У чыстых абноўленых аўдыторыях пачынаецца новы навучальны год. Было б добра, кад адчуванне свята працягвалася як мага даўжэй...

*С. ІВАНОВА.*



РЭХА АЛІМПІЯДЫ

# НАШЫ – У АТЛАНЦЕ

У той ліпеньскі вечар рэктар універсітэта Л. М. Ківач, як часта бывае, затрымаўся ў сваім кабінеце. Тэлефонны званок з Атланты ўзрушыў яго, хоць напярэдадні Леанід Мікалаевіч ужо перажыў хвалюючы момант ля экрана тэлевізара, калі нашы, універсітэцкія хлопцы, здабывалі сабе алімпійскія медалі на барцоўскім дыване ў нялёгкіх паядынках з сапернікамі па грэкарымскай барацьбе.

Прыемна было пачуць узрушаны голас і віншаванні рэктара і Вячаславу Аляксандравічу Максімовічу. Там, у Атланце, было досыць хваляванняў і ў яго, трэнера Нацыянальнай зборнай Беларусі па грэкарымскай барацьбе, і тым больш у хлопцаў, якія змагаліся за медалі, дарэчы, за першыя медалі для зборнай рэспублікі.

Алімпійскае срэбра прывёз з Атланты ў Гродна студэнт другога курса факультэта фізвыхавання Аляксандр Паўлаў. На шляху да Алімпіяды ў яго быў чэмпіянат свету 1994 года, прызёрам якога стаў наш зямляк, а таксама першынства Еўропы сярод моладзі.

Валерый Цыленьць - нядаўні выпускнік універсітэта, бронзавы прызёр чэмпіяната свету 1994 года, чэмпіён Савецкага Саюза па грэкарымскай барацьбе сярод моладзі. У Атланце ён стаў бронзавым прызёрам.

Аляксандр Сідарэнка - студэнт 5 курса універсітэта, у нядаўнім - чэмпіён рэспублікі, сёлета ўдала выступіў на чэмпіянаце Еўропы. Чацвёртае месца на Алімпіядзе - чым не падстава для гонару, а можа, і першая прыступка да "золата"...

І перад ад'ездам зборнай рэспублікі на алімпійскія гульні, і пасля вяртання з Атланты спартсменаў цёпла вітаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка. Віншаванне гродзенскіх чэмпіёнаў адбылося ў райвыканкаме. Горача вітаў і універсітэт сваіх выхаванцаў, наладзіўшы ўрачыстасць з нагоды вяртання іх з XXVI летніх Алімпійскіх гульняў.

Не шмат вольнага часу ў нашых алімпійцаў зараз. 7 верасня - першая сустрэча з харватамі на Кубак Еўропы, якая адбудзецца ў Гродне, у новай спартыўнай зале па вул. Урублеўскага, 1а. Дарэчы, гэтыя спартыўныя спаборніцтвы абяцаюць быць надзвычай прадстаўнічымі і захапляльнымі. Суправаджаць спартыўныя паядынкі на дыване будуць выступленні зорак беларускай эстрады. А 21 верасня нашы хлопцы павінны ўжо выступаць у Загрэбе, пасля - спаборніцтвы на кубак Адрыятыкі. Няхай жа нашым алімпійцам і там садзейнічае поспех! Вяртайцеся пераможцамі!

*С. БЕРАСТ.*

---

АРХЕАЛАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА

# Што памятаюць пласты зямлі?

Палатно асфальтаванай дарожкі, скіраванай да будынку Новага замка, перш чым прапусціць вас за масіўныя вароты архітэктурнага комплексу, прывядзе да велічнай драўлянай скульптуры. Падараваная нашаму старажытнаму гораду, вось ужо некалькі гадоў выява Вітаўта Вялікага - на варце гэтага гістарычнага пляцу. Старыя сцены і брукі, а больш - пласты зямлі памятаюць свайго ўладара, дзякуючы намаганням якога ў 1384 годзе наш горад стаў другой сталіцай Вялікага княства Літоўскага, "За плячыма" Вітаўта Вялікага, адразу за агароджай - глыбокі раскоп. Тут ужо тры летнія практыкі шчыруюць нашы студэнты - гісторыкі. Літаральна кожны камячок зямлі, кожны каменьчык і асколачак прасеяны праз іх пальцы. Бо любая драбніца можа быць каштоўнай у гэтым пошуку.

Лета ўжо перахілілася на жнівень і на раскопе змоўк студэнцкі гоман. Мы падыйшлі сюды разам з кіраўніком практыкі, аспірантам універсітэта Р.М. Акінчыцам. Рыгор Мікалаевіч, ледзь спыніліся мы ля раскопу, зазначыў, што брук, на якім мы стаім - пакладзены ў 18 стагоддзі. Вельмі добра захаваўся на ім і выкладзены з нахілам ад будынкаў равок для сцёку дажджавой вады. Гэты брук адкапаны пад пластом "сучаснай" зямлі таўшчынёй 30-40 сантыметраў. А ўвесь раскоп дасягае чатырох метраў у глыбіню. Гледзячы на "сцены", як да далоні можна лічыць пласты вякоў. Археолагі, ведаючы структуру пластоў, могуць вызначыць іх даўніну, а таксама прасачыць стыхійныя бедствы (пажары), войны, што паклалі адбітак попелам, рэшткамі збудаванняў, асколкамі зброі і г.д.

Знаходкі гэтага раскопу яшчэ раз пацвердзілі, што менавіта недзе тут стаяла Васкрасенская царква, аб якой згадваецца ў гістарычных крыніцах. Вядома, што яна згарэла ў адным з пажараў, а была пабудавана, мабыць, у 12 стагоддзі. І летась, і сёлета археолагі знайшлі ў раскопе дэкаратыўныя гліняныя пліткі, плінфы, фрагменты дэкаратыўных упрыгожванняў, металічных вырабаў. Знаходак, мабыць, было б больш, але месца раскопу закранула збудаванні цеплатрасы Старога замка. Гэта склала сур'ёзныя перашкоды ў працы археолагаў, хоць папярэднія ўзгадненні перад пачаткам раскопу не прагназавалі гэтых нязручнасцяў. Зараз сцены раскопу асыпаюцца, можа быць парушана ўмацаванне камунікацый. У жніўні ўжо востра ставілася пытанне: ці раскоп закансерваваць да новага сезону, ці закрыць наогул. Бо да так званага прыроднага "мацерыка" яшчэ трэба капаць і капаць, а гэта ўжо небяспечна.

Пласты зямной тоўшчы сведчаць таксама, што на працягу вякоў тэрыторыі Новага і Старога замкаў "зблізіліся" за лік земляных насыпаў. Пляцоўка Новага, напрыклад, з цягам часу ўсё больш пашыралася. Можа, з прычыны абарончай тактыкі, можа з іншай якой нагоды.

Група практыкантаў ачышчала ад зямлі муры замка Вітаўта, якія выходзяць да Гараднічанкі. Сярод археалагічных знаходак быў фрагмент кафлі з выявай "Пагоні". З гэтай кафлі, як удакладніў у гутарцы Р. Акінчыц, былі складзены печы Старога замка ў 16-пачатку 17 стагоддзя.

На вялікі жаль, сёлетнім летам студэнты не знайшлі ў раскопах больш нічога асабліва адметнага, надзвычайнага, але і тыя драбніцы, што прайшлі праз іх рукі, далі нямала цікавай інфармацыі для навукі і гісторыі. Можа, іншым студэнтам у наступныя гады пашчасціцца больш, можа, іншыя знойдуць тут свой "залаты ключык..."

*С. МУРЫНА.*





# Бе-La-Русь - 96

Три страны, три молодежных лагеря, три дня и три ночи, и все это в одном слове - " Бе - La - Русь". Что же это за аббревиатура? Какой смысл хранит?

Молодежь из трех государств, - Беларуси, Латвии и России съехалась в лагерь, который уже пятое лето открыт под этим звучным красивым именем. Расположен он прямо на стыке границ трех стран. Организуют его поочередно молодежные союзы стран-участниц. На этот раз организатором выступал Российский Союз молодежи. В это лето стать участником фестиваля, по приглашению ЦК Союза молодежи Беларуси, посчастливилось СТЭМу "Вернисаж", удачно выступившему не так давно на первом республиканском фестивале студенческих коллективов. Нашему театру поручено было право представлять Республику Беларусь на открытии лагеря. И ребята отлично выдержали этот своего рода экзамен. Зрители, а их было около четырех сотен, восторженно рукоплескали и, как обычно на наших выступлениях, смеялись до слез.

А начиналось открытие лагеря с приветствия лидеров Союзов молодежи трех государств. Были оглашены приветственные телеграммы от правительств Беларуси, Латвии, России. Это придало открытию некоторую официальность. Но чем ближе к ночи, тем раскованнее становилось настроение: завязывались знакомства, братания. Ребята приглашали друг друга к своим кострам. Так что к полночи оживление в лагере достигло апогея. Развлечения были на любой "вкус": спортивные состязания, конкурсы, концерты группы "Манго-Манго" и американского джазиста Тима Стронга, дискотеки, незаметно переходящие... в утреннюю физзарядку. Театр "Вернисаж" не был пассивным наблюдателем, наши ребята принимали посильное участие во всех мероприятиях. А пиком восторга, как для зрителей, так и для непосредственных участников, был КВН и море шуток, волны импровизаций, шквал аплодисментов, ураган смеха, а, значит, и океан радостных лиц и дружеских улыбок, отдавших предпочтение... нашей команде! Кстати, капитаном команды, костяк которой составил СТЭМ "Вернисаж", был Александр Федута. Он же - один из основателей лагеря 5 лет тому назад.

Разъезжаться не хотелось. Но прощались с надеждой, что еще встретимся...

*Валерий ЛЯХОВИЧ.*

Отоспавшись, освежившись ледяной водой из пограничной речки, молодежь начинала действовать: играть, выигрывать и проигрывать. По поводу жилищных условий - никаких нареканий, порою крышей служило небо: где упал, там и спал.

...Самыми беспокойными казались белорусы. Все 24 часа в сутки белорусская часть лагеря, как, впрочем, и остальные, не затихала. Попев, попрыгав, поорав, один засыпает, другой просыпается - и так далее.

С россиянами знакомиться совсем просто, сказывается единство языка. А откуда только россияне не приехали, разве что с Камчатки и Владивостока.

Латыши - самая спокойная часть лагеря, хоть это люди без комплексов - все, поголовно.

Самое яркое впечатление, на мой взгляд, церемония вручения наград. По всем показателям впереди белорусы: КВН, Мисс и Мистер лагеря, эстафета, волейбол. Только футбол - второе место. Напоследок устроили салют, - видимо, пограничники постарались к ракетам салюта присоединились пробки от шампанского.

Лагерь на границе трех республик долго останется в памяти. Это не просто какой-то слет: приехали, погуляли, разъехались и забыли. "Бе - La - Русь" - объединение особенное и главное, самое лучшее из того, что нужно нам всем - мне, тебе, ему!

*Александр КАШУБА.*




Лагерь оставил массу впечатлений, которые трудно выразить словами. Все было чудесно, как в сказке. Лагерь "Бе - La - Русь" - это братство без границ. Это - романтика: лес, палаточные улицы, десятки костров одновременно, гитары, тени... Лагерь "Бе - La - Русь" - это оригинально: живешь в Латвии, выступаешь в Беларуси, а чистишь зубы и моешься в России. Лагерь - это, наконец, шикарное развлечение: "ногоотшибающие" дискотеки до утра и "рукоотшибательные" концерты и сотни новых отличных друзей.

*Сергей ПАВЛОВ.*

## СЭРВІС ПА-ПРАГРЭСАЎСКУ

Жадаеце гарачы духмяны хот-дог? Калі ласка, некалькі хвілін і са спецыяльнага прыстасавання здымуць зарумяненую булачку, з "сэрцавіны" якой выглядае сакавітая сасіска. Хочаце паліць кетчупам? Калі ласка! А можа, з маянэзам, з сырам? Будзе! Хочаце кубачак кавы? Усяго хвілінку - і гатова. Просіце "колу" ці іншы газіраваны напой? Пададуць яшчэ хутчэй.

Можаце сабе дазволіць са стыпендыі гарачы тлусты кавалак бройлернай курыцы з апетытнай ружовай скарыначкай? Пакуль пагутарыце з сябрамі за асвяжальным напоем, гаспадыня Надзея Кірылаўна ўключыць канвекцыйную цуда-печ і праз 20-30 хвілін - частуйцеся! Яшчэ хутчэй прыгатуе запяканку з тварагом, напрыклад. Пакаштуеце - яшчэ не адзін раз прыйдзеце сюды. Куды? Вы да гэтага часу не ведаеце, дзе бройлерныя куры, копчаныя каўбасы і іншыя смакі прадаюць без гандлёвай надбаўкі? Тады зазірніце ў буфет студэнцкага інтэрната № 2 па вуліцы Даватара. Тут багаты гаспадар, вядомы як былы калгас "Прагрэс", арганізаваў гандлёвую кропку, каб і сваю прадукцыю хутчэй рэалізаваць, і студэнтаў забяспечыць снеданнем - якасная і недарагой стравай, якую можна набыць, не выходзячы з інтэрната.

У памяшканні буфета, а ён больш нагадвае экспрэс-кафе - сучасны інтэр'ер, тут утульна, прыгожа, іграе музыка. Работніцы буфета Н.К. Фаніберг і яе памочніца гатовы абслугоўваць невялікія банкеты.

Вас чакаюць і гасцінна запрашаюць!

## ЛЕТА - ПАРА АДПАЧЫНКУ

Хоця і цяжка універсітэту з фінансамі, аднак адміністрацыя і прафсаюзны камітэт знайшлі сродкі на летняе аздараўленне супрацоўнікаў і іх дзяцей. На гэтыя мэты выдаткавана 130 мільёнаў рублёў са сродкаў прыбытку, атрыманага ад гаспадарча-разліковай і камерцыйнай дзейнасці універсітэта.

57 дзяцей супрацоўнікаў змаглі летам адпачыць у дзіцячым лагеры "Вясёлка" на Нёмане, у міжкалгасным лагеры "Баравічок", у санаторыі "Радон".

Жадаючыя адпачыць супрацоўнікі атрымалі санаторныя пуцёўкі ў Друскінінкай і ў "Радо́н". Дарэчы, як адзначыў у гутарцы з карэспандэнтам "Гродзенскага універсітэта" старшыня прафкама У.А. Хілюта, Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі мае магчымасць выдзеліць толькі адну пуцёўку на 1000 членаў прафсаюза. І наш калектыў атрымаў усяго 9 пуцёвак на першае паўгоддзе (5 для дарослых, 4 - дзіцячыя).

*Рэдактар*
С. МУРЫНА
Карэктура
Н.ДУДКО
*Камп'ютарная вёрстка*
Ю.РАДСА
*Камп'ютарны набор*
М.ВЕРСТАК

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас:* *230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 404.*
*44-72-97*

Газета выходзіць адзін раз у месяц.
Аб'ём - 1 друк. арк.

*Здадзена ў набор 21.08.96 г.*
*Заказ 63*
*Наклад 500 асобнікаў.*

Газета набрана, звярстана і аддрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №519.

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.*